# Варкшопы па працы з дэзынфармацыяй




Capacity for Democracy, RadarBY
і Digital Skills Coalition Belarus
запрашаюць беларусаў і беларусак
на інтэрактыўныя навучальныя варкшопы

Гранты да
**2000 €**
на каманду




## Тэмы варкшопаў:

- OSINT і праверка адкрытых крыніцаў
- Маніторынг і аналіз дэзынфармацыйных наратываў
- Выяўленьне і дэбанкінг прапагандысцкіх мэсаджаў і кампаніяў
- Адказнае выкарыстаньне AI
- Лічбавая бясьпека і этыка

- **1–2 жніўня** — Вільня
- **7–8 жніўня** — Варшава
- **22–23 жніўня** — Бэрлін

Пры наяўнасці бюджэту могуць пакрывацца пражываньне і дарога

Удзел магчымы толькі ў адным варкшопе

**Сфармуй каманду або падавайся індывідуальна – лепшыя праекты атрымаюць фінансаваньне**

Civil Society Cooperation · Federal Foreign Office · Capacity 4 Democracy · RadarBY · Skills – Digital Skills Coalition Belarus

# Навучыцеся супрацьстаяць дэзынфармацыі і атрымайце 2000 эўра на ўласны праект!

Capacity for Democracy, RadarBY і Digital Skills Coalition Belarus запрашаюць на інтэрактыўныя навучальныя варкшопы па працы з дэзынфармацыяй у Вільні, Варшаве і Бэрліне. Пасьля мерапрыемстваў прадугледжана праграма грантаў на праекты па тэме дэзынфармацыі да 2000 эўра на каманду.

Варкшопы сфакусаваныя на ўмацаваньні ведаў і практычных здольнасьцяў у кірунку маніторынгу, выяўленьня і барацьбы з прапагандай. Удзел бясплатны. Запрашаюцца як дасьведчаныя беларускія журналісты_кі і прафэсіяналы_кі, так і людзі, зацікаўленыя ў пашырэньні сваіх ведаў і кола кантактаў па тэме.

Праца прадугледжвае практычную падрыхтоўку па наступных напрамках:

- мэтады праверкі адкрытых крыніцаў OSINT (геалякацыя, спадарожнікавыя здымкі, аналіз мэтададзеных і г.д.);
- маніторынг і аналіз дэзынфармацыйных наратываў;
- выяўленьне і дэбанкінг прапагандысцкіх мэсаджаў і кампаніяў;
- адказнае выкарыстаньне інструмэнтаў штучнага інтэлекту для аналізу і праверкі;
- лічбавая бясьпека і этычныя стандарты ў журналістыцы, працы з дэзынфармацыяй і расьсьледаваньнях.

**** Зьмест варкшопаў у кожным з гарадоў будзе падобны.***

***** Бясьпека ўдзельнікаў і ўдзельніц – наш прыярытэт. Удзельнікі і ўдзельніцы пройдуць працэс вэрыфікацыі. Падчас варкшопаў будуць дзейнічаць правілы Chatham House і забароненыя фота, відэа і аўдыязапіс.***

****** Адбор удзельнікаў_ніц будзе базавацца на некалькіх крытэрах, такіх як матывацыя, досьвед па тэме, далейшыя пляны на выкарыстаньне атрыманых ведаў і навыкаў і г.д.***

Запрашаем Вас абіраць горад і зарэгістравацца:

**1-2 ЖНІЎНЯ – ВІЛЬНЯ**
https://forms.gle/RSJQHYKkDBqiH8o49

**7-8 ЖНІЎНЯ – ВАРШАВА**
https://forms.gle/8WqLmo2apPMeUq6m8

**22-23 ЖНІЎНЯ – БЭРЛІН**
https://forms.gle/nCk62JAuaTga4L9U8

## ‼ ДЭДЛАЙН 20 ЛІПЕНЯ ‼

Рэгістрацыя адкрытая і для ўдзельнікаў зь іншых гарадоў і краін. Арганізатары пры наяўнасьці бюджэту могуць пакрыць выдаткі на пражываньне і дарогу (у межах вызначаных лімітаў), а таксама забясьпечваюць харчаваньне і ўсе неабходныя матэрыялы падчас варкшопаў.

Падчас варкшопаў удзельнікі і ўдзельніцы будуць мець шанец сфарміраваць свае каманды (ці працаваць індывідуальна) і распрацаваць праект па абранай тэме варкшопа, дзе можна будзе на практыцы прымяняць атрыманыя навыкі і веды. Лепшыя праекты атрымаюць фінансаваньне да 2000 эўра.

Запыт на гранты будзе апублікаваны пасьля правядзеньня ўсіх варкшопаў, каб удзельнікі і ўдзельніцы мелі аднолькавы час на рэалізацыю праектаў. На ажыцьцяўленьне праектаў будзе адведзены адзін месяц. Праекты могуць быць рознымі па аб’ёме, але бюджэт ня мусіць перавышаць 2000 эўра. Тып праекту можа быць які заўгодна, галоўнае — адпаведнасьць тэме дэзынфармацыі і барацьбы з прапагандай. Гэта можа быць як аналітычны праект, маніторынг і дасьледаваньне, так і дэбанкінг ці журналісцкае расьсьледаваньне. Фінансаваньне ўсіх праектаў не гарантуецца — толькі найлепшыя праекты, абраныя камісіяй, атрымаюць сродкі на рэалізацыю. Каманды могуць падаць больш за адзін праект. Падчас рэалізацыі будзе прапанаваная мэнтарская дапамога і кансультаваньне. Пасьля завяршэньня праектаў таксама прадугледжаная абавязковая прэзэнтацыя вынікаў працы і справаздачнасьць.

Варкшопы и грантавая падтрымка фінансуецца Міністэрствам замежных справаў Нямеччыны і Праграмай супрацоўніцтва з грамадзянскай супольнасьцю нямецкага ўраду.

Вельмі чакаем вас у Вільні, Варшаве і Бэрліне!

CIVIL SOCIETY COOPERATION
Federal Foreign Office
CAPACITY 4 DEMOCRACY
RADARBY
sKIIIS DIGITAL SKILLS COALITION BELARUS